Рэмаркі пра маркі

Як ствараюць беларускія паштовыя мініяцюры

Часам сцвярджаюць, што камп'ютарны век з яго разнастайнымі месенджарамі ўрэшце прымусіць нас адмовіцца ад некаторых традыцыйных паштовых паслуг. Маўляў, навошта гарадзіць агарод, калі той жа смартфон за лічаныя секунды звяжа з патрэбным абанентам літаральна ў любым кутку зямнога шара.
Але ёсць і супрацьлеглая думка: як бы ні развіваліся ІТ-тэхналогіі, яны ніколі не заменяць такі спецыфічны від чалавечых узаемаадносін, як ліставанне. Нікуды не падзенуцца і яго галоўныя атрыбуты, у тым ліку паштовыя маркі, якія, між іншым, прынята лічыць нават адным з сімвалаў дзяржаўнага суверэнітэту.
Аглядальнік «Беларускай думкі» пабываў у выдавецкім цэнтры «Марка» рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Белпошта», дзе якраз і ствараюць айчынныя паштовыя мініяцюры.

Найперш варта зазначыць, што беларускія маркі маюць не такую ўжо і даўнюю гісторыю. Пачынаецца яна ад 20 сакавіка 1992 года. Менавіта ў той дзень выпусцілі ў абарачэнне першую айчынную паштовую мініяцюру «Крыж Еўфрасінні Полацкай». Пэўны час маркі паводле замоў Міністэрства сувязі і інфарматызацыі выдавалі ў Расіі, бо ў Беларусі не было адпаведнай паліграфічнай базы. І толькі пасля таго, як з'явілася неабходнае абсталяванне, іх пачалі тыражаваць у нас. Гэтым стала займацца друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку» (цяпер яшчэ і Бабруйская ўзбуйненая друкарня імя А.Ц. Непагодзіна). Прынамсі, там у красавіку 1995-га выпусцілі, так бы мовіць, цалкам беларускія паштовыя мініяцюры. Яны прысвячаліся 50-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне і былі ўведзены ў абарачэнне незадоўга да юбілейнай даты.

Праз няпоўны год пасля гэтай падзеі на Белпошце стварылі выдавецкі цэнтр «Марка». Паводле слоў начальніка Ірыны Шыпілавай, нягледзячы на

Дызайнер Марына Віткоўская «ўпрыгожвае» штогод каля 50 паштовых марак



Беларускія паштовыя мініяцюры неаднаразова ўваходзілі ў топ-10 самых прыгожых марак свету. Высокую ацэнку атрымалі блокі «200 гадоў з дня нараджэння Напалеона Орды», «850-годдзе стварэння Крыжа Еўфрасінні Полацкай», «Пчалярства ў Беларусі» і марачны ліст «Слуцкія паясы».

адносна невялікі штат – тут працуе 39 чалавек, прадпрыемства забяспечвае поўны цыкл – ад стварэння макетаў маркіраванай і немаркіраванай прадукцыі да яе рэалізацыі. Штогод спецыялісты распрацоўваюць каля тысячы сюжэтаў, якія затым выкарыстоўваюцца на марках, канвертах і паштоўках.

Дакладнасць і навуковы падыход

Адна справа прыдумаць тэму і сюжэт чарговай паштовай маркі, зусім іншая – выкласці задумку на паперы, стварыўшы паўнавартасную мастацкую мініяцюру. Сярод адказных за гэты працэс – Аляксандр Міцянін. З «Маркай» у яго даволі доўгае супрацоўніцтва. Упершыню мастак прапанаваў свае паслугі выдавецкаму цэнтру ў 2003 годзе. Гэта была марка з серыі «Птушка года», прысвячалася яна дамавому вераб'ю. Здавалася б, па-мастацку ўвасобіць птушынага «героя» прафесіяналу нескладана, бо вось ён, верабей, штодня навідавоку. Тым не менш, згадвае Аляксандр Аляксандравіч, давялося пакарпець, перш чым атрымалася нешта прыдатнае: унікаў у звычкі птушкі, вывучыў

Клясер (альбом) з айчыннымі паштовымі мініяцюрамі карыстаецца попытам у філатэлістаў

Аляксандр Міцянін «малюе» паштовыя маркі з 2003 года

шмат чаго з вераб'іных асаблівасцей. Надзвычай дапамагло тое, што паводле адукацыі Аляксандр заолаг, добра арыентуецца ў арніталогіі. Пасля вараб'я ў яго амаль штогод была «свая» птушка: гарадская ластаўка, барадатая няясыць, кнігаўка, салавей, белая чапля, шэрая гусь, пусталька, вялікі краншнэп, чорны стрыж, удод… Чарговай работай мастака на птушыную тэматыку стала марка, прысвечаная сімвалу сёлетняга года – звычайнаму ляляку, адзінаму прадстаўніку казадоепадобных птушак у Беларусі. Спецыяльнае гашэнне гэтай адметнай мініяцюры адбылося на сталічным паштамце ў пачатку сакавіка.

– Перш за ўсё для мяне важная навуковая дакладнасць тых прадстаўнікоў флоры і фаўны, якіх даводзіцца адлюстроўваць на марках, – зазначае суразмоўца. – Калі ўзяць, напрыклад, матылькоў, то на малюнку неабходна перадаць не толькі колеравую гаму крыльцаў насякомага і колькасць кропачак, калі яны там ёсць, але і спалучыць у адзіную кампазіцыю шмат іншых фактараў. Скажам, «аб'яднаць» матылька канкрэтнага віду менавіта з той кветкай, з якой ён любіць сталавацца. Ці возьмем птушку 2021 года – ляляка. Яго ніяк нельга намаляваць у звычайным гняздзе, бо гэтая птушка пад прыкрыццём расліннасці робіць толькі невялікую ямку ў зямлі і там выседжвае птушанят. Недарэчна будзе выглядаць ляляк і на галінцы дрэва ўпоперак: ён заўсёды абірае пазіцыю ўздоўж, і гэта ў спалучэнні са своеасаблівай афарбоўкай дапамагае маскіравацца, робіць яго падобным да кавалачка кары.

Маркі серыі «Птушка года Беларусі» выдаюцца невялікімі марачнымі лістамі з купонамі і мастацкім афармленнем палёў у дадатак. Традыцыйна да кожнага выпуску вырабляецца паштовая картка для картмаксімуму (у правым верхнім кутку наклеена марка з такім жа малюнкам і стаіць штэмпель першага дня гашэння). Наогул жа, як зазначае Ірына Шыпілава, тэма флоры і фаўны найбольш папулярная і запатрабаваная ў сусветнай філатэліі. У прыярытэце яна і ў выдавецкага цэнтра Белпошты – прыкладна траціна беларускіх паштовых мініяцюр. Шырока прадстаўлена тэма айчынных запаведных тэрыторый. Маркі розных гадоў прысвечаны Бярэзінскаму біясфернаму запаведніку, Белавежскай і Налібоцкай пушчам, нацыянальным паркам «Прыпяцкі», «Нарачанскі», «Браслаўскія азёры». Шмат паштовых мініяцюр выпушчана ў серыі

За амаль 30 гадоў у Беларусі выпусцілі каля 1400 найменняў паштовых марак.

«Дзіцячая філатэлія», дзе адлюстраваны дзіцяняты дзікіх жывёл і птушак. Карыстаюцца папулярнасцю маркі серый «Яйкі птушак Беларусі», «Чырвоная кніга Рэспублікі Беларусь» і шэраг іншых. Белпошта рэгулярна атрымлівае дазвол на выкарыстанне лагатыпа Сусветнага фонду прыроды (WWF) на марках з рэдкімі відамі фаўны нашай краіны. Так, сумесна з фондам выдадзены серыі пра еўрапейскіх бабра і рысь, чорнага бусла, рагатага дзядка (від стракоз) і рабога сусліка. Цеснае супрацоўніцтва наладжана і з Сусветнай асацыяцыяй прыродаахоўных арганізацый па ахове птушак BirdLife International, а таксама з айчынным грамадскім аб'яднаннем «Ахова птушак Бацькаўшчыны», аб чым сведчыць выкарыстанне іх эмблем на марках.

І ўсё ж не толькі прыроднай тэматыкай вызначаюцца беларускія маркі. Яны нагадваюць нам пра важныя падзеі ў жыцці краіны, юбілейныя і памятныя гістарычныя даты, высокія дасягненні суайчыннікаў у самых розных сферах, знакамітых пісьменнікаў, вядомых дзяржаўных дзеячаў і славутых землякоў. Так, сёлета ўжо выпусцілі ў абарачэнне паштовы маркіраваны блок «Народныя пісьменнікі Беларусі» да 125-годдзя з дня нараджэння Кандрата Крапівы і 100-гадовых юбілеяў Івана Шамякіна і Івана Мележа і марку, прымеркаваную да 30-годдзя арганізацыі рэгіянальнай садружнасці ў галіне сувязі СНД. Летась асобнымі маркамі адзначаны 75-я гадавіна Перамогі, юбілеі цесна звязанага з Беларуссю сусветна вядомага мастака Фердынанда Рушчыца, стваральніка рэактыўнай і звышгукавой авіяцыі Паўла Сухога, народнага пісьменніка Андрэя Макаёнка, а таксама 550-годдзе з'яўлення цудатворнага абраза Жыровіцкай Божай Маці.

– У сярэднім штогод выдаём больш як 50 марак і тэматычных паштовых блокаў, – працягвае Ірына Шыпілава. – Кожная навінка, не пабаюся гэтага слова, сапраўдны мастацкі шэдэўр, заснаваны адначасова на карпатлівай працы, пэўнай даследчыцкай дзейнасці і, канешне, на творчасці. Неабходна яшчэ ведаць і ўлічваць шэраг безумоўных патрабаванняў, у тым ліку і паліграфічныя магчымасці друкарань, ад строгага выканання якіх залежыць канчатковы вынік усёй працы. Дарэчы, у нашым калектыве зусім нямногія калекцыяніруюць паштовыя маркі, бо ў іх – наша жыццё, а яго, як вядома, якім бы ты заўзятым філатэлістам ні быў, не змесціш у альбоме…

Марачныя спецэфекты

Паводле слоў Ірыны Шыпілавай, тэндэнцыі апошніх гадоў такія, што, з аднаго боку, растуць патрабаванні да арыгінал-макетаў марак, а з другога – ідзе пэўная аптымізацыя формы: ухіл на зручныя памеры марачных лістоў, наяўнасць купонаў і па-мастацку

аформленых палёў. Смялей выкарыстоўваюцца паслядрукарскія паліграфічныя тэхналогіі: выбарачная лакіроўка, тэрмічнае цісненне металізаванай фольгай і іншыя. З'явіліся незвычайныя маркі – у выглядзе трохвугольніка, круга, авала і нават дрэва, як, напрыклад, мініяцюра, прысвечаная 550-годдзю з'яўлення цудатворнага абраза Жыровіцкай Божай Маці.

Асаблівы гонар вытворцаў айчынных паштовых марак – элементы абароны ад падробак. Скажам, на мініяцюры, прысвечанай першаму палёту чалавека ў космас, дзе дамінантай выступае выява Юрыя Гагарына, толькі пад ультрафіялетавай лямпай можна прачытаць яго знакамітае «Паехалі!», што, уласна, адрознівае арыгінал ад фальшыўкі. Існуюць таксама іншыя спецсродкі барацьбы з падробкамі. Аднак, як падкрэслівае суразмоўца, ахвотных займацца няўдзячнай справай фальсіфікату няшмат. Тым не менш даводзіцца прымаць асаблівыя меры па абароне марачнай прадукцыі, бо паштовыя маркі, па сутнасці, спецыфічны эквівалент грашовых знакаў, падрабляць іх нельга.

Выкарыстоўваюць пры вырабе беларускіх паштовых мініяцюр і магчымасці сучасных IT-тэхналогій. Напрыклад, на некаторых з іх «прапісваюць» так званую дадатковую рэальнасць: калі навесці на марку камеру смартфона, папярэдне спампаваўшы дадатак Ar Marka Belarus, адлюстраваная на ёй выява «ажывае» па зададзеным загадзя сцэнарыі. Адной з першых у 2019 годзе «акрыяла» марка да 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Вельмі цікава ўспрымаецца дадатковая рэальнасць на леташняй мініяцюры, яе вырабілі ў межах сумеснага праекта-конкурсу «Старажытныя паштовыя маршруты», які

На сучасных беларускіх марках «прапісваюць» дадатковую рэальнасць: калі навесці на выяву камеру смартфона, яна «ажывае».

праводзіўся па міжнароднай праграме Europa сярод дзяржаў – удзельніц Асацыяцыі паштовых аператараў Еўропы (PostEurop). Нашу краіну «прадстаўляла» марка пра паштовы шлях «Кракаў – Варшава – Горадня – Вільня». Знакаміты маршрут у 1583 годзе зацвердзіў вялікі князь Стэфан Баторый. Мастацкае аздабленне беларускай паштовай мініяцюры было прыязна адзначана еўрапейскай філатэлістычнай супольнасцю.

Бясспрэчна, усё гэта спрыяе прывабнасці і пазнавальнасці беларускіх паштовых марак. Пра іх адметнасць кажуць як айчынныя філатэлісты, так і замежныя калекцыянеры. Невыпадкова ў пачатку 2018 года дзейнасць выдавецкага цэнтра «Марка» адзначана Спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта Беларусі. Высокай узнагароды калектыў удастоены за значны ўклад у захаванне духоўнай спадчыны нашага народа, стварэнне высокамастацкіх паштовых марак да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання і да 135-гадовых юбілеяў з дня нараджэння нацыянальных класікаў Янкі Купалы і Якуба Коласа, а таксама да іншых знамянальных гісторыка-культурных дат і падзей.

Пра высокі клас айчынных марак сведчаць і прэстыжныя ўзнагароды міжнароднага ўзроўню. Беларускія паштовыя мініяцюры неаднаразова

ўваходзілі ў топ-10 самых прыгожых марак свету па выніках Венскай міжнароднай выставы – аднаго з найбольш вядомых філатэлістычных форумаў Еўропы, які рэгулярна, пачынаючы ад 1881 года, праводзіцца ў сталіцы Аўстрыі. Так, адпаведна ў 2007 і 2011 гадах былі ацэнены паштовыя блокі «200 гадоў з дня нараджэння Напалеона Орды» і «850-годдзе стварэння Крыжа Еўфрасінні Полацкай», а ў 2014 і 2016 гадах – марачны ліст «Слуцкія паясы» і паштовы блок «Пчалярства ў Беларусі». Залаты медаль айчынная філатэлістычная прадукцыя атрымала на Сусветнай выставе паштовых марак China 2019 у кітайскім горадзе Ухань. Статусны форум адбыўся літаральна за некалькі месяцаў да разгулу там сумна вядомай сёння каранавіруснай інфекцыі.

Высокі рэйтынг у філатэлістычным свеце мае і наша нацыянальная выстава «Белфіла». Дзясятая па ліку адбылася ў Брэсце паўтара гады таму. Акрамя суайчыннікаў, удзельнічалі калекцыянеры і вытворцы паштовай прадукцыі з 16 краін, у тым ліку з Бразіліі, Германіі, ЗША, Ізраіля, Ірландыі, Партугаліі.

– Шмат чаго робім дзеля папулярызацыі філатэліі сярод аматараў-калецыянераў, – працягвае кіраўнік выдавецкага цэнтра. – Найперш праз конкурс-апытанне выбіраем найлепшую паштовую марку года. У сёлетнім узялі ўдзел каля дзвюх тысяч чалавек. Вынікі хутка стануць вядомы. Фаварытаў некалькі, у іх ліку і паштовая мініяцюра, прысвечаная 550-годдзю цудатворнага абраза Жыровіцкай Божай Маці. А каму дастануцца лаўры найлепшай маркі 2020 года, пакажа час. Давайце крыху пачакаем.

Адзіны ў краіне выдавецкі цэнтр марачнай прадукцыі падтрымлівае цесныя сувязі з Беларускім саюзам філатэлістаў, асобнымі калекцыянерамі. Такое супрацоўніцтва ўзаемакарыснае і дае свой плён. На прадпрыемстве заўсёды рады любой падказцы, якая спрыяе паляпшэнню справы, з удзячнасцю прымаюць прапановы наконт тэм і сюжэтаў паштовых мініяцюр. Але дзеля справядлівасці зазначым, ідэі «збоку» не так часта падтрымліваюць прафесіяналы, бо далёка не кожнаму аматару ўдаецца стварыць выяву, якая адпавядае шэрагу строгіх крытэрыяў. І ўсё ж ахвотныя аказаць сваё садзейнічанне ёсць. І іх нямала, што не можа не радаваць кіраўніка выдавецкага цэнтра.

Сёння спецыялісты «Маркі» працуюць над макетамі прадукцыі, якая пабачыць свет у другім паўгоддзі, рыхтуюць праекты на 2022 год. А гэта значыць, што ў Беларусі з'явяцца новыя адметныя паштовыя мініяцюры на радасць філатэлістаў і многіх з нас, хто па-ранейшаму любіць калі-нікалі адправіць паштоўку, упрыгожыўшы яе якой-небудзь адметнай маркай…

Сяргей ГАЛОЎКА.

Фота з архіва выдавецкага цэнтра «Марка»